УДК 947.6

# РЫЖСКАЯ КАТАЛІЦКАЯ ДУХОЎНАЯ СЕМІНАРЫЯ І РЭЛІГІЙНАЕ ЖЫЦЦЁ РЫМА-КАТОЛІКАЎ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ Ў 1970–80-я гг.

**Пушкін Ігар Аляксандравіч**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій
(г. Магілёў, Беларусь)

*Асвятляецца рэлігійнае жыццё каталіцкага насельніцтва БССР у 1970-1980-я гг.: колькасць рэлігійных аб'яднанняў, дзейных касцёлаў, ксяндзоў, веруючых прысутных падчас асноўных рэлігійных святаў; падрыхтоўка святароў для рыма-каталіцкай царквы ў Рыжскай каталіцкай духоўнай семінарыі.*

У выніку ганенняў на вернікаў у першай палове 1960-х гг. значна скарацілася колькасць зарэгістраваных абшчын і храмаў, паменшылася колькасць святароў. Партыйна-савецкае кіраўніцтва ўсяляк перашкаджала памкненням насельніцтва задаволіць свае рэлігійныя запатрабаванні [7, с. 282–285]. З другой паловы 1960-х гг. пачынаецца новы этап рэлігійнага жыцця насельніцтва Беларусі – перыяд параўнальна стабільнага стану рэлігійных арганізацый пры татальным кантролі за іх дзейнасцю (1965–1985 гг.). У 1970–80-я гг. назіралася павялічэнне актыўнасці католікаў, што было абумоўлена некалькімі прычынамі [12]. Напрыклад, на святкаваннях Пасхі 26.03.1978 г. у касцёлах было каля 100 тыс. вернікаў, што на 7–8 тыс. больш чым у 1977 г. [3, арк. 63]; у 1979 г. прысутнічала 111 тыс чалавек [4, арк. 26-27]. У 1983 г. у 103 касцёлах Беларусі на Пасху малілася каля 110 тыс. чалавек. Найбольш перапоўненымі былі: г. Гродна – Фарны, Бернардзінскі і Францысканскі касцёлы, у г. Глыбокае, у вёсках Солы і Вішнева Смаргонскага раёна [8, арк. 63-66]. У Віцебскай вобласці, дзе было 11 каталіцкіх рэлігійных аб'яднанняў, таксама назіраўся рост наведваемасці касцёлаў: 1980 г. – 9314; 1984 – 11539 чал. [5, арк. 4-10]

На пачатку 1980-х гг. у БССР дзейнічала 109 каталіцкіх рэлігійных аб'яднанняў (з іх 6 не зарэгістраваных), якія абслугоўвалі 45 ксяндзоў (не ўлічаны святары касцёлаў Мінскай вобласці і г. Мінска). Найбольшая колькасць – 71 знаходзілася ў Гродзенскай вобласці, у Гомельскай і Магілёўскай не было ніводнага дзейнага (існавалі 2 не зарэгістраваных аб'яднання католікаў у Магілёўскай вобласці) [2; 10, с. 249]. На 1.01.1986 г. на тэрыторыі БССР было 111 касцёлаў. Дзейнічала 104 каталіцкіх рэлігійных аб'яднання (52 ксяндза) і 8 не зарэгістраваных аб'яднанняў [11, с. 1-6].

Для гэтага часу быў характэрным катастрафічны недахоп дзейных храмаў і святароў. Каб выправіць становішча Упаўнаважанаму савета па справах рэлігій па БССР неаднаразова паступалі калектыўныя заявы ад ксяндзоў і веруючых з патрабаваннямі адкрыць каталіцкую семінарыю, заснаваць епіскапат [1, арк. 14–15]. Але ўсім ім былі дадзены адмоўныя адказы. Падрыхтоўка святароў для рыма-каталіцкай царквы ў БССР адбывалася ў Рыжскай каталіцкай духоўнай семінарыі, якая была заснавана ў 1920 г. і ў 1970–1980-я гг. рыхтавала рэлігійныя кадры для рэспублік СССР (у 1977 г. яна атрымала статус усесаюзнай).

З 1975 па 1985 гг. Рыжскую рыма-каталіцкую семінарыю скончылі – 38 асоб, якія атрымалі статус ксяндза. У 1985 г. на вучобу ў семінарыю былі прыняты 3 украінцы, 2 палякі, 2 беларусы, эстонец. З іх два з Гродзенскай вобласці БССР.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

На 1.10.1985 г. у семінарыі навучаліся на 6 курсах – 62 слухача 7 нацыянальнасцей: латышоў – 13, палякаў – 21, украінцаў – 12, беларусаў – 6, немцаў – 7, эстонцаў – 2, рускіх – 1. У пастанове Савета па справах рэлігій пры СМ СССР "Аб мерах па ўзмацненню кантроля за выкананнем заканадаўства аб рэлігійных культах каталіцкімі аб'яднаннямі ў БССР" (1982) адзначалася, што апаратам Упаўнаважанага Савета ўвесь час вядзецца праца па адбору кандыдатаў на вучобу ў Рыжскую каталіцкую духоўную семінарыю з ліку лаяльных вернікаў і з улікам іх месца жыхарства. У той час нярэдкімі былі выпадкі, калі ў семінарыю прымалюя асобы, якія раней пражывалі на тэрыторыі БССР і для паступлення ў семінарыю спецыяльна пераехалі ў Латвійскую ССР. Яны ўладкоўваласяна працу качагарамі, вартаўнікамі ў мясцовыя касцёлы, рознарабочымі на дзяржаўныя прадпрыемствы. Шмат выпускнікоў Рыжскай рыма-каталіцкай семінарыі сталі ксяндзамі ў прыходах БССР: ігар Лашук, Міхал Сапель,Уладзіслаў Завальнюк, Эдмунд Даўгіловіч-Навіцкі, Францішак Кісель, Чэслаў Курэчка [9, с. 234–236].

На працэс актывізацыі дзейнасці вернікаў і нацыянальнай ідэнтычнасці насельніцтва вельмі моцна паўплывала палітыка "перабудовы". У кіруючыя органы СССР і ЦК КПСС былі накіраваны дзесяткі лютоў і калектыўных заяў вернікаў з Ліды і Смаргоні Гродзенскай вобласці, Гомеля, Браслава Віцебскай вобласці і іншых месцаў Беларусі аб рэгістрацыі рэлігійных арганізацыйі вяртанні касцёлаў. За 11 месяцаў 1989 г. аднавілі дзейнасць 20 зарэгістраваных касцёлаў. Пад час святкавання "Пасхі" у касцёлах было каля 130 тыс чалавек, што на 30 тыс. больш чым у 1988 г. [6, арк. 1, 6, 13, 17-18, 39].

Каб знайсці выйсце з складанага кадравага пытання напрыканцы 1980-х гг. было вырашана зрабіць стаўку не на тэрытарыяльны фактар, а на нацыянальны. Было дазволена запрасіць абмежаваную колькасць ксяндзоў з ПНР у месцы кампактнага пражывання палякаў, што актывізавала працэс па стварэнні польскіх нацыянальных аб'яднанняў у Беларусі. Адбылося супадзенне рэлігійнага і нацыянальнага фактараў, намераў і мэтаў уладаў Польшчы і СССР.

Такім чынам, у БССР нягледзячы на нястомнае змаганне з рэлігійнымі пачуццямі, камуністычным уладам не ўдалося выкараніць іх са свядомасці людзей. Падрыхтоўка святароў у Рыжскай каталіцкай духоўнай семінарыі дазваляла, нягледзячы на перашкоды з боку ўладаў, юнаваўшым рыма-каталіцкім абшчынам Савецкай Беларусі ў 1970–1980-я гг. працягваць сваю абмежаваную афіцыйную дзейнасць і забяспечваць рэлігійныя запатрабаванні вернікаў.

## Літаратура


1. Заява групы вернікаў католікаў БССР ад 26.04.1978 г. // Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). – Ф. Р-6991. Воп. 6. Спр. 1558.

2. Звесткі аб наяўнасці рэлігійных аб'яднанняў, служкаў культу па абласцях БССР // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 38-45 ; Спр. 33. Арк. 81-88 ; Спр. 49. Арк. 151-171 ; Спр. 59. Арк. 66-73.

3. інфармацыя аб выніках назірання за святкаваннем каталіцкай "Пасхі" ў БССР. Красавік 1978 г. // НАРБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 51.

4. інфармацыя аб выніках назіранняў за святкаваннем "Пасхі" у рэлігійных аб'яднаннях, якія дзейнічаюць на тэрыторыі БССР у 1979 г. // ДАРФ. – Ф. Р-6991. Воп. 6. Спр. 1558. Арк. 26–27.

5. інфармацыя аб святкаванні "Пасхі" у рэлігійных аб'яднаннях Віцебскай вобласці ў 1985 г. // ДАРФ. – Ф. Р-6991. Воп. 6. Спр. 3078.

6. інфармацыя аддзела Савета па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР // ДАРФ. – Ф. Р-6991. Воп. 6. Спр. 4080.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

7. Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX стст. ) / В. В. Ґрыгор'ева, У. М. Завальнюк, У. І. Навіцкі, А. М. Філатава; навук. рэд. У. І. Навіцкі. – Мінск: ВП «Экаперспектыва», 1998. – 340 с.
8. Ліст у ЦК КПБ "Аб выніках назірання за выкананнем заканадаўства аб культах у дні святкавання Пасхі" ад 27.05.1983 г. // НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 151. Спр. 56.
9. Пушкин, И. Латвийское влияние на религиозную жизнь советской Беларуси / И. Пушкин, М. Королёв // Латвия–Беларусь: 1918–2018 : [коллективная монография] / редкол. М. Королёв (гл. ред.) и др. – Минск: Четыре четверти, 2018. – С. 230-238.
10. Пушкін І. А. Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гг.). – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2010. – 319 с.
11. Справаздачная даведка Упаўнаважанага Савета па справах рэлігій па БССР ад 14.01.1986 г. // ДАРФ. – Ф. Р-6991. Воп. 6. Спр. 3129.
12. Puszkin, ihar. Wpływ wizyt papieża Jana Pawła II w Poisce na aktywność iudności katolickiej i świadomość językowo-etniczną Poiaków w Białorusi / ihar Puszkin // Poiacy na Białorusi od końca XIX do początku XXI wieku. Wybrane probiemy stosunków poisko-białoruskich / pod redakcją Tadeusza Gawiлa. – Warszawa, 2017. – S. 383–395.
Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова